Дарагая наша Радзіма, любая маці-Беларусь! Каб стаць сінявокай мірнай калыскай пад белымі крыламі, колькі ж выпрабаванняў ты прайшла! Колькі гора і пакут перажыў твой народ! Ты недалічылася кожнага трэцяга жыхара ў гады страшэннай вайны. Твае сыны аддавалі жыццё за спакой, свабоду і незалежнасць, за будучыню, у якой нам сёння выпала жыць. Подзвіг твой — ў нашых сэрцах. Няхай жа заўсёды над табой будзе мірнае неба!

# З ДНЁМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ, РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ!

*Подзвіг народа Беларусі праслаўлены ў радках паэтаў Гродзеншчыны.*

**Тамара Кашавая**

**САЛДАТ АЙЧЫНЫ**

**Як цёплы ветрык з роднай стараны,**
**Прыйшоў, каму — на фронт, каму — на ганак,**
**Той самы першы ранак без вайны,**
**Такі цудоўна-непаўторны ранак.**

**О, што тады рабілася з людзьмі!**
**Хто песні галапаніў да знямогі,**
**Хто ёкатам, хто ціхімі слязьмі —**
**Віталі тое свята Перамогі.**

**І весела жалезнаму каню**
**Ляцець было ў зваротную дарогу!**
**Глядзелі вочы, нібы ўпершыню,**
**І ледзь шапталі вусны: "Слава богу..."**

**...Стаіць салдат Айчыны на мяжы**
**Гарматамі — узворанага поля...**
**А ён жывы. І радасць на душы,**
**Што абмінулі гора і нядоля.**

**Што ацалелі жонка і бацькі,**
**Сынок падрос, як каласок, таненькі...**
**Шчаслівы, пэўна, лёс яго такі,**
**Шчаслівы, пэўна род яго навекі.**

**Тут цішыня без выбухаў гармат,**
**Бы кліча зноўку з сіламі сабрацца,**
**А рукі, што трымалі аўтамат,**
**Так знудзіліся па сялянскай працы.**

**Мне верыцца — краіна будзе жыць!**
**Нас не закуць у ланцугі і краты,**
**Пакуль на самым крайчыку мяжы**
**Стаіць салдат — зямлі сваёй араты.**

Жнівень, 2010

**Анатолий Апанасевич**

**ФРОНТОВИКАМ**

**Им жизнь не делала поблажек —**
**Когда войны сгустился дым,**
**То и больной, и слабый даже,**
**Влились в защитников ряды.**

**Им от Москвы и до Берлина**
**Не просто выпало пройти:**
**Они легенды и былины**
**Верстали на своем пути.**

**Ложились шрамы, как борозды,**
**На лица и на души им,**

**Одним на грудь слетали звезды,**
**И к изголовию — другим.**

**Они всегда: как в мирной жизни,**
**Так в каждом яростном бою,**
**Как стяг, несли любовь к Отчизне**
**И независимость свою.**

**Фёдар Чычкан**

**ВОЧЫ ВЕТЭРАНАЎ**

**Дзень будзённы святочныя строі надзеў,**
**У зіхоткія фарбы і ўсмешкі ўвабраны,**
**Раптам выбухнуў ён, завірыў, загудзеў,**
**Як у школьную залу ўвайшлі ветэраны.**

**Іх няшмат засталося з тых грозных часоў,**
**Каб успомніць аб першым баі і бамбёжцы.**
**Сівізна буйна ўсыпала рэдзь валасоў,**
**Тым не менш, не старэюць душой пераможцы.**

**Вочы строга глядзяць на прыціхлых дзяцей,**
**Быццам гарт іх душэўны даследуюць.**
**Нас, маўляў, да сябе запрашайце часцей.**
**Вунь як войны суседзяў праследуюць.**

**І няхай у вас іншыя сёння куміры,**
**Подзвіг наш вас да сёння адорвае мірам.**

**Алла Никипорчик**

*** * ***
**Всё становится временем.**
**Всё остаётся памятью.**
**Но кто вернёт четвертую берёзу**
**вечному огню Хатыни?!.**

*** * ***
**Вдохновение лучей и музыки.**
**Взлёты счастья и листвы.**
**...Слышу, как вздыхает земля**

**под тяжестью обелисков.**

*** * ***

**Светло и беспощадно в мае.**
**Светло – от солнца.**
**Беспощадно – от памяти.**

**Алена Руцкая**

**І ПАМЯЦЬ, І ПАШАНА, І ЛЮБОЎ**

**Пажарышчы,**
**руіны,**
**каміны…**
**Са здымка з той, апошняе вайны,**
**Мой горад, ты ўглядаешся ў мяне,**
**Нібы праверыць хочаш, ці кране**
**Маю душу твой незагойны боль,**
**Боль тых, хто тут ахвяраваў сабой,**
**У чый апошні дзень прыйшлі яны:**
**Пажарышчы,**
**руіны,**
**каміны…**
**Праменнасць,**
**зеляніна**
**і блакіт**
**У Шчары сонца асляпляльны плыт,**
**Прыветнасць зіхатлівых аканіц,**
**Бурштынавыя крылы заранiц,**
**Шчымлівая задумлівасць прысад —**
**З дзяцінства мой усцешвалі пагляд,**
**Ад злыбеды ахоўвалі, як шчыт:**
**Праменнасць,**
**зеляніна**
**і блакіт.**

**Виктор Кудлачёв**

**ВОСПОМИНАНИЯ**

**Много дней, много лет пролетело,**
**Как Победы салют отгремел.**

У меня голова побелела,
Переделал немало я дел.

Предо мною встают фронтовые
В испытаньях суровых года,
Дорогие друзья боевые,
Что домой не придут никогда.

Вспоминаются Брест и Варшава,
И поверженный вражий Берлин,
Где советского воина слава
Вознеслась до незримых вершин.

Сколько б лет ни прошло, не забуду
Годы в жарких сраженьях, во мгле...
Как свидетели прошлого, всюду
Обелиски стоят на земле.

Людмила Шевченко

ВЕЧНЫЙ ОГОНЬ

Молилась женщина огню,
Как Богу, как святой иконе,
Молилась будущему дню,
Сложив по-старчески ладони.

Она не замечала нас,
Забыв про город многолюдный.
Ей, видно, вспомнился сейчас
Погибший сын... И стало трудно

Дышать. Звучал в душе орган
Надрывно, горестью и низко,
Взметнулись стоны к облакам,
И руки рвутся к обелиску.

В слезинках на ее лице
Играют огненные блики,
Скорбят на мраморном кольце
О павших на войне гвоздики.

**И низко в пояс поклонясь,**
**Застыла женщина в молчаньи.**
**Ее фигурка у огня**
**Людское привлекла вниманье.**

**И ощутили люди ясно**
**В сквозной, тяжелой тишине,**
**Что бьется кровь в гвоздиках красных**
**Солдат, погибших на войне.**

**Молилась женщина огню,**
**Тому, что на могиле братской.**
**Молилась будущему дню,**
**Святому дню, взывая к братству...**

**Ірына Касянкова**

**МАЛІТВА  МАЦІ**

**Гаравала матухна. Не прыйшлі з вайны,**
**Згінулі, не вернуцца родныя сыны.**
**Сэрца моцна сціснула, цёмна ў вачах.**
**Душу ўсю ахутала полымя і  жах.**

**Думкі закруціліся: "А навошта жыць?!**
**Ці, вайну праклятую, ці сябе вініць,**
**Што чацвёра хлопчыкаў у чужой зямлі.**
**Мо магілкі травамі, зеллем зараслі,**
**Мо ў полі дзе-небудзь бедныя ляжаць.**
**Каб магла хоць дзетачак родных пахаваць!"**

**Так з адчаем крыкнула Богу ў вышыню:**
**“Я замест  крывіначак лягу ў зямлю!**
**Злітуйся,  мой Божачка, забяры мяне!**
**Ні аднога хлопчыка смерць хай не кране!"**

**І любоў матуліна падняла сыноў.**
**Усе з вайны вярнуліся да сябе дамоў.**
**Ды насустрач матухна выйсці не змагла –**
**За сыноў, за родненькіх, у зямлю лягла.**

**Георгий  Киселёв**

***

**Без  вас, фронтовики, я – сирота,**
**Без  вас, осколки старших поколений.**
**О сколько светлых и святых мгновений**
**Мне подарила ваша доброта!**

**Я от судьбы не ворочу лица**
**И, может быть, смешон в наивной вере,**
**Но вижу в каждом старике отца –**
**В солдате старом или офицере.**

**Ещё я сам по жизни молодец,**
**Хоть голод лет военных не дал росту,**
**Но каждому, кого зову «отец!»,**
**Мне хочется отдать моё сиротство.**

**Прильнуть к ещё могучему плечу,**
**Пропахшему навек солдатским потом.**
**И это чувство я не расплещу**
**По ежедневным нуждам и заботам.**

**И потому, когда в последний путь**
**Несут отставника иль ветерана,**
**Тоска такая разрывает грудь,**
**Как будто там – открывшаяся рана.**

**Гляжу в черты застывшего лица,**
**Бреду в толпе до вечного приюта.**
**И вот она – прощания минута…**
**В который раз я хороню отца.**

**Ірына Данік**

**НЕВЯДОМЫ САЛДАТ**

**Невядомы салдат...**
**Чый ён бацька ці сын?**
**Адкажы, каземат,**
**Адкажыце, лясы.**

**Адкажы, той квадрат,**
**Дзе насмерць ён стаяў,**
**Як чужынцаў караў**
**І як сам паміраў?!**

**Ды маўчаць верасы,**
**Толькі кроплі з галля...**
**І за ўсіх: “Ён мой сын!” –**
**Адказала зямля.**

